**ВЫБАРЧАЯ КАМІСІЯ**
**па правядзенні выбараў**
**у Каардынацыйную Раду III склікання**

# ПРЭС-РЭЛІЗ

**1 траўня 2024 года** **г. Варшава**

**Выбарчая камісія па правядзенні выбараў у Каардынацыйную Раду III склікання (далей - Выбарчая камісія) ў асобах Алены Прыходзька (старшыні), Андрэя Атаманчука, Яраслава Бекіша, Дзмітрыя Лазавіка, Альвіны Мінгазавай і Алены Філатавай па стане на 15:00 (CET) 1 траўня 2024 года ІНФАРМУЕ:**

1. **Адбыліся наступныя змены ў спісах кандыдатаў выбарчых суб'ектаў:**

- **Кандыдат Яраславў Гамолка ўключаны ў спіс выбарчага суб'екта "Блок Пракоп'ева-Ягорава" пад нумарам 32 у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 29 красавіка 2024 года. Падставай для ўключэння яго ў спіс кандыдатаў стаў разгляд звароту інцыятара выбарчага спісу Паўла Патапава, у якім апошні звярнуў увагу Камісіі на дасыланне Яраславам Гамолкам неабходных дадзеных і праходжанні такім чынам працэдуры верыфікацыі, неабходнай для зацвярджэння ў спісе кандыдатаў. Нягледзячы на тое, што дадзеныя ад Яраслава Гамолкі паступілі па сканчэнні запатрабаванага Выбарчай камісіяй тэрміну прыёму, Камісія пагадзілася з неабходнасцю ўключэння кандыдата ў спіс, зыходзячы з наступнага: 1) выбарчы суб'ект "Блок Пракоп'ева-Ягорава" зарэгістраваны рашэннем ад 23 красавіка 2024 года №24/04/23-3, у пераліку кандыдатаў якога значыўся Яраслаў Гамолка пад нумарам 32; 2) Палажэнне аб выбарах у Каардынацыйную раду не ўтрымлівае абавязковых тэрмінаў праходжання кандыдатамі верыфікацыі і, адпаведна, позняе дасыланне дадзеных не з'яўляецца парушэннем.**

- **Кандыдат Аліна Коўшык (Коўшык-Петшыкоўска) ўключана ў спіс выбарчага суб'екта "Еўрапейскі выбар" пад нумарам 2 у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 30 красавіка 2024 года. Падставай для ўключэння яе ў спіс кандыдатаў стала дасыланне 29 красавіка 2024 года дадзеных для верыфікацыі: 1) імя і прозвішча згодна з ідэнтыфікацыйным дакументам; 2) імя і розвішча, якое кандыдат жадае ўказаць у спісе; 3) абгрунтаванне неабходнасці ўказаня анкетных дадзеных, адрозных ад пашпартных. 30 красавіка 2024 года ад кандыдата паступіла згода на ўказанне ў спісе кандыдатаў яе сапраўднага прозвішча. Раней кандыдат адмаўлялася дасылаць сваё сапраўднае прозвішча ў адпаведнасці з беларускай транслітэрацыяй і прасіла яго не ўказваць у спісе кандыдатаў выбарчага суб'екта. Выбарчая камісія пагадзілася з неабходнасцю ўключэння кандыдата ў спіс, зыходзячы з наступнага: 1) выбарчы суб'ект "Еўрапейскі выбар"**

зарэгістраваны рашэннем ад 23 красавіка 2024 года №24/04/23-4, у пераліку кандыдатаў якога значылася Аліна Коўшык пад нумарам 2; 2) кандыдат даслала неабодныя адзеныя для верыфікацыі і зацвярджэння яе ў спісе кандыдатаў; 3) кандыдат адмовілася ад патрабавання не ўказваць у спісе яе сапраўднае прозвішча і даслала правільнае яго напісанне; 4) Палажэнне аб выбарах у Каардынацыйную раду не ўтрымлівае абавязковых тэрмінаў праходжання кандыдатамі верыфікацыі і, адпаведна, перашкоды для ўключэння ў спіс кандыдатаў адсутнічаюць.

- Кандыдат выбарчага суб'екта “Воля” Вадзім Кабанчук пад нумарам 1 выключаны са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 30 красавіка 2024 года. Падставай для выключання кандыдата са спісу стала яго просьба, накіраваная ім 29 красавіка 2024 года на адрас Выбарчай камісіі.

- Кандыдат выбарчага суб'екта “Аб'яднанне палітычных партый Народная Грамада і Беларуская Хрысціянская Дэмакратыя “Салідарнасць” Павел Бялюцін пад нумарам 8 выключаны са спісу кандыдатаў у адпаведнасці з рашэннем Выбарчай камісіі ад 1 траўня 2024 года. Падставай для выключання кандыдата са спісу стаў зварот, накіраваны выбарчым суб'ектам 1 траўня 2024 года на адрас Выбарчай камісіі, які ўтрымліваў адпаведную просьбу і дадаткова паведамлялася аб выключэнні Паўла Бялюціна з партыі “Народная грамада”.

2. Выбарчая камісія на пасяджэнні 29 красавіка 2024 года разгледзіла скаргі, накіраваныя кандыдатамі выбарчых суб'ектаў і прыняла рашэнні аб адмове ў іх здавальненні:

- Заяўнік Аліна Коўшык (Коўшык-Петшыкоўска) прасіла адмяніць рашэнне аб выключэнні яе кандыдатуры са спісу выбарчага суб'екта “Еўрапейскі выбар”. Аргументацыя заяўніка будавалася на тым, што Выбарчая камісія, патрабуючы падаць звесткі пра сапраўднае прозвішча кандыдата, ажыццяўляе неправамернае ўмяшанне ў яе асабістае і сямейнае жыццё. Акрамя таго, рашэнне Камісіі, як вынікае са скаргі, пераследуе нелегітымныя мэты і стварае пагрозу для здароўя насельцтва, а таксама ягонай бяспецы. Выбарчая камісія не палічыла аргументы заяўніка пераканаўчымі, адмовіла ў здавальненні скаргі і праінфармавала пра магчымасць цягам 24 гадзін абскардзіць рашэнне (якое ў адпаведнасці з Палажэннем разглядаецца публічна). З тэкстам рашэння можна азнаёміцца тут.

- Заяўнік Надзея Нортан (Сычугова) прасіла ўнесці змены ў пастанову Выбарчай камісіі ад 25 расавіка 2024 года “Аб зацвярджэнні выбарчых суб'ектаў”, а менавіта, выключыць са спісу яе прозвішча паводле ідэнтыфікацыйнага дакумента “Сычугова”. Аргументацыя заяўніка грунтавалася на тым, што прозвішча “Сычугова” было апублікавана без дазволу каныдата і ўяўляе небяспеку для яе сваякоў у Беларусі. Выбарчая камісія не пагадзілася з довадамі заяўніка, адмовіла ў здавальненні скаргі і праінфармавала пра магчымасць

цягам 24 гадзін абскардзіць рашэнне (якое ў адпаведнасці з Палажэннем разглядаецца публічна). З тэкстам рашэння можна азнаёміцца тут.

3. Кандыдаты Аліна Коўшык (Коўшык-Петшыкоўска) і Надзея Нортан (Сычугова) не сталі аспрэчваць прынятыя Выбарчай камісіяй рашэнні па падзеных імі скаргах.

4. Выбарчая камісія нагадвае, што выбарчы працэс ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб выбарах у Каардынацыйную раду ад 31 сакавіка 2024 года паводле стандартаў адкрытых, галосных, празрыстых і дэмакратычных выбараў. Адпаведна, Выбарчая камісія, выконваючы публічныя функцыі, зацікаўлена ў транспарэнтнасці выбарчага працэсу і заўжды адкрыта для зваротаў прадстаўнікоў сродкаў масавай інфармацыі па пытаннях выкладання афіцыйнай пазіцыі. Выбарчая камісія лічыць важным і неабходным для забеспячэння даверу грамадскасці да выбараў адлюстраванне ў медыя як звестак пра прынятые афіцыйных рашэнняў, так і іх аргументацыі, што адпавядае стандартам журналістыкі.

5. Выбарчая камісія нагадвае кандыдатам выбарчых суб’ектаў пра неабходнасць падчас правядзення агітацыі і публічных выступаў адпавядаць добраахвотна ўзятым на сябе абавязкам выконваць этычныя і камунікатыўныя нормы і правілы згодна з Мемарандумам аб прынцыпах і правілах удзелу ў выбарчай кампаніі ў Каардынацыйную раду Беларусі. У выпадку парушэнняў Выбарчая камісія будзе неадкладна рэагаваць.

Старшыня Выбарчай камісіі А. Прыходзька